ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

# У суладдзі з Сусветам

Мяркуючы па вашых водгуках, шаноўныя чытачы, рубрыка “Сімвалы мудрасці жыцця”, якую вялі вядомыя даследчыкі народнай культуры і традыцый Аксана Катовіч і Янка Крук, знайшла сваіх адданых прыхільнікаў. Таму тэму народных уяўленняў аб роднай прыродзе і навакольным свеце і звязаных з імі абрадаў і прыкмет мы з гэтымі аўтарамі рашылі на старонках “РП” працягнуць. Балазе, расказаць цікава і змястоўна яшчэ можна шмат пра што. Напрыклад, пра нябесныя свяцілы. Ці пра першаэлементы стварэння свету: зямлю, ваду, агонь, паветра... А яшчэ — пра камяні і крыніцы, пра прадказанне надвор'я па стану месяца, народных святах, паводзінах жывёл. Карацей, пра тыя сакральныя веды, якімі валодалі нашы продкі, жывучы ў суладдзі і гармоніі з наваколлем і цэлым Сусветам. Можа, гэтыя набытыя веды дапамогуць знайсці гармонію і вам?

# Сонца іншасвету



Фота Аляксандра ВАЛАДЗЬКО

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Асаблівасці маральна-этычных адносін да Месяца ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян

**Знаёмства з асноўнымі прынцыпамі пабудовы беларускага традыцыйнага календара, з абрадавай паэзіяй і шматлікімі кантэкстамі гаспадарчай дзейнасці, у якіх прыхавана сакральна-магічная кампанента, сведчыць пра тое, які моцны ўплыў на фарміраванне сістэмы вымярэння часу аказаў Месяц. Ён праходзіць у сваім поўным колазвароце чатыры фазы па 7-8 дзён, што дало чалавецтву падставы для ўтварэння такой адзінкі вымярэння часу, як тыдзень, а поўны цыкл візуальнага пераўтварэння (29,53 сутак) паспрыяў узнікненню такой адзінкі часу, як месяц.**

Аснову міфапаэтычнай карціны свету складаюць шматлікія бінарныя апазіцыі, у якіх акцэнтавалася ўвага на ключавых касмічных, прыродных і сацыяльных процістаяннях: дзень і ноч, жыццё і смерць, верх і ніз, мужчынскае і жаночае... У народных касмаганічных і міфапаэтычных уяўленнях Месяц заўсёды супрацьпастаўлялі Сонцу і асацыіравалі з “тым”, іншым светам, светам памёршых: *“Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое — уночы”.*

*“З высокай дарогі глядзіць бычок крутарогі”* — так, з-за сваёй выявы ў першую і трэцюю фазы Месяц параўноўвалі з бычком ці каровай, якія маюць рогі. Аднак часцей за ўсё ў загадках яго называлі рагатым пастухом, які пасе на небе авечак (зоры): *“Поле не мерана, авечкі не злічаны, пастух рагаты”.*

У асяроддзі беларусаў поўны цыкл Месяца падзяляецца на наступныя фазы:

*межы* (руск. “новолуние”) — тры пешыя дні новага цыкла Месяца, калі начное свяціла не бачна ў небе;

*маладзік* — першая чвэрць Месяца, калі ён з'яўляецца на небе ў выглядзе вузкага сярпа, павернутага ўправа (калі да яго ўмоўна падставіць вертыкальную рысачку, то атрымаецца выява літары “Р” — “растучы”);

*поўня* — той час, калі дыск Месяца бачны з Зямлі цалкам;

*ветах, збыта* — апошняя чвэрць, калі Месяц “пераварочваецца” ў адваротны бок (улева) і ўтварае літару “С” (таму яго яшчэ называюць “стары”).

У традыцыйнай светапогляднай сістэме вакол кожнай з іх існуе даволі разгорнутая сістэма міфалагічных уяўленняў, кожная рознабакова прадстаўлена ў этнакультурнай традыцыі беларусаў і з'яўляецца своеасаблівым кодам або ўніверсальным алгарытмам, у адпаведнасці з якім на працягу шматлікіх стагоддзяў праводзіліся асноўныя сельскагаспадарчыя, земляробчыя, жывёлагадоўчыя, будаўнічыя і вытворчыя работы, асэнсоўвалася бязмежная колькасць рытуальна-абрадавых, сімвалічных дзеянняў і адраснай прымеркаванасці ў сферы народнай аграноміі, ветэрынарыі, медыцыны; з апорай на вопыт назіранняў за станам надвор'я прагназаваўся будучы ўраджай або рабіліся аддаленыя па часе прадказанні.

### *Межы, або "чэрнець" — "пераходная" фаза Месяца*





Фота Аляксандра ВАЛАДЗЬКО

*"Не ляжы на мяжы, хвароба наклічаш"* — у народнай культуры беларусаў месца разрыву (узмежак, мяжа, якая падзяляла поле, луг, сваю і чужую гаспадарку) надзялялася негатыўнымі якасцямі, лічылася небяспечным. Аналагічнае стаўленне было і да таго часу, той нябачнай мяжы, калі Месяц "перанараджаўся", каб зноў з'явіцца на небе. Часавая мяжа паміж "маладым" і "старым" Месяцам атрымала прасторавае найменне — "межы". Фаза Месяца межы, або чарнец, лічылася пераходнай і ўспрымалася ў народнай свядомасці негатыўна. Адна з прычын — адсутнасць начнога свяціла на небасхіле. Месяц называлі Сонцам іншасвету (руск. "загробного мира") і верылі, што ў гэты час ён вяртаецца са свету памёршых, а ў такім становішчы ён мог прыцягнуць да чалавека бяду. Другая прычына — вера, што той момант, калі Бог не глядзіць на зямлю ніводным вокам (Месяц і Сонейка лічыліся вачыма Бога), спрыяе нячыстай сіле (ведзьмакам, калдунам, нячысцікам) тварыць свае "цёмныя", а значыцца не асвечаныя ні Сонцам, ні Месяцам справы. Менавіта пра гэта расказваецца ў казках і паданнях, калі чорт або ведзьма выкрадае з неба Месяц, каб нашкодзіць людзям і жывёле.

Калі разглядаць гаспадарчую ці магічна-абрадавую дзейнасць чалавека ў дачыненні да фазаў Месяца, то неабходна падкрэсліць, што ў гэтым кантэксце дамінаваў фундаментальны прынцып народнай культуры "падобнае выклікае падобнае". Сувязь была празрыстай і выразна матывіраванай: адсутнасць свяціла ў начным небе, г. зн. "касмічная пустэча", магла спрацаваць "пустэчу" як у жыцці, так і ў працоўнай дзейнасці чалавека. Адна з назваў гэтай фазы Месяца, якая прыжылася на Палессі, пустыя дні. Адсюль узніклі прадказанні і папераджальныя правілы наконт выканання нейкай працы або, наадварот, парада перачакаць гэты неспрыяльны час. На межах ніколі не спраўлялі вяселле: засцерагаліся, каб не застацца бяздзетнымі; не вадзілі карову на злучку; не саджалі квактуху на яйкі; стараліся не адпраўляцца ў дарогу, не куплялі жывёл, не саджалі і не сеялі, лічылі гэтыя справы "пустымі".

Межы або "касмічную пустату" выкарыстоўвалі ў кантэксце дзеянняў, скіраваных на "знішчэнне" або "ліквідаванне": рабілі пасынкаванне памідораў, падразалі дрэвы і кусты, знішчалі пустазелле; пазбаўляліся ад барадавак, мазалёў, лішаёў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Фазу Месяца, калі яго не бачна на небе, яшчэ называлі чарнец, або “чорная луна” (для параўнання: у сучасных календарах графічная выява гэтай фазы — чорнае кола). У адным з паданняў расказваецца як Каін, які забіў Авеля, засмаліў Месяц (абмазаў смалой), таму што той бачыў забойства, расказаў Сонцу, за што і быў пакараны. З той пары Месяц выходзіць ноччу, а некалькі дзён яго ўвогуле нябачна.

### *“Маладзік малады, твой рог залаты”*



За многія стагоддзі назіранняў за станам прыроды і яго ўплывам на жыццядзейнасць чалавека сталася так, што найбольшая колькасць назіранняў і рэгламентацый, зафіксаваных у свядомасці нашых продкаў і адлюстраваных у творах вусна-паэтычнай спадчыны ўсходніх славян, звязана з першай квадрай Месяца — маладзіком. Станоўчыя адносіны да маладзіка грунтуюцца на асацыяцыі пачатку, росту.

Прывядзём літаральна некалькі прыкладаў, узятых з розных сфер жыцця і дзейнасці чалавека. На маладзіковай фазе капалі калодзеж; прышчэплівалі дрэвы; стрыглі валасы і пазногці; авечак; “лён мочуць толькі ў маладзіку... будзе белым”; білі кабана; збіралі зёлкі. Разам з тым: “не гадзіцца чысціць коміны ў маладзік”, яны хутка засмеціцца зноў. Да маладзіка стараліся прымеркаваць пачатак доўгатэрміновай справы, напрыклад, вяселля.

Маладзічок карыстаўся асаблівымі знакамі павагі сярод народных лекараў. Шмат захворванняў раілі лячыць або “загаворваць” на маладзік, напрыклад, “выгрызаць” грыжу, лячыць застарэлую хваробу, вочы, зубны боль.

Усе жыццесцвярждальныя абрадава-рытуальныя дзеянні прымяркоўвалі да маладога Месяца, але ведалі, што самымі спрыяльнымі для такіх спраў днямі з’яўляюцца некалькі дзён, максімальна прыбліжаных да поўні. Нашы продкі верылі, што дзейнічае неабвержная сувязь чалавека з космасам. Прычым, яна знаходзіцца ў самай прамой залежнасці і ніколі не забывалі асноўны прынцып народнага светасузірання — прынцып падабенства: *“Як Месяц на небе расце, прыбывае, так і шчасце, дабрабыт, грошы, здароўе ў хаце і сям’і будуць прыбываць”*; “каб усё было поўна”. Пад поўню стараліся залажыць першы вянец новага зруба, “каб было, як кажуць, поўнаю чашаю”. На Палессі самымі шчаслівымі лічылі тых, хто справіў вяселле за некалькі дзён да поўні. Часцей за ўсё на вяселлі гучала пажаданне: *“Жадаем шчасця поўню”*. Тыя, хто займаўся рыбным промыслам, прасілі, каб ніткі на сеткі прала цяжарная жанчына і абавязкова пад поўню, каб у сетках было “поўна” рыбы.

### *“У месяцовай поўні таямніц поўна”*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА

Час, калі візуальная выява Месяца дасягала максімальных памераў, лічыўся адпаведна момантам яго найбольшага ўплыву на наваколле і фізічны стан чалавека. Гэта акалічнасць стала прычынай узнікнення шматлікіх засцярог і рэгламентацый.

Гэты час раілі перачакаць, устрымацца ад падарожжаў, не пачыналі доўгатэрміновых спраў. Поўня максімальна “напаўняла” арганізмы вадкасцю, таму ў гэты час не нарыхтоўвалі дровы або “будаўнічы матэрыял” для новай хаты; не абразалі, не прышчэплівалі дрэвы. У поўню трэба ліць менш малака, класці менш мукі для выпечкі хлеба, “інакш будзе пераліваціца цераз край”. Забаранялася што-небудзь выносіць з хаты, пазычаць ці аддаваць, каб не вынесці з хаты “сваю поўню”, г. зн. шчасце, дабрабыт. Засцерагаліся, каб святло поўні не падала на чалавека, інакш яму будуць сніцца жахі, яго будзе турбаваць бяссонніца, твар стане непрыгожым, чалавек захварэе..

Разам з тым у характарыстыцы поўні былі і станоўчыя моманты. Сяляне раілі: класці новую печ; зачынаць сяўбу, каб “калоссе было поўным”; сеяць або саджаць “круглую” гародніну (гарбузы, капусту), яны будуць вялікімі, як поўня.

### *“Пасеяўшы на сходу, не дажыдай плоду”*



Неспрыяльнай для правядзення сельскагаспадарчых і дамашніх работ, а таксама для перспектыў будучага жыцця лічылася трэцяя квадра Месяца, якую ў народзе называлі старык, збыта, на сходні, ветах. У некаторых мясцінах пачатак (першыя дні) апошняй квадры Месяца называюць рушанне. Сімволіка збыта або знішчэння абумоўлівала характар працы: у гэты час займаліся праполкай, пасынкаваннем, выкарчоўвалі кусты, “падстрыгалі” дрэвы; знішчалі шкоднікаў садоў і агародаў; самы лепшы час для нарыхтоўкі пер’я для пасцелі — збыта.

Аналіз часу правядзення рытуальных дзеянняў у народнай медыцыне, скіраваных на знішчэнне, прыпыненне хваробы, паказвае, што практычна ўсе іх трэба праводзіць на збыта. Каб звесці бародаўкі, трэба на ветаху ўзяць белую нітку, завязаць над кожнай бародаўкай вузельчык, а затым яе закапаць. Калі нітка згніе ў зямлі, тады і бародаўкі знікнуць; “веташком самае лепшае ад глістоў даваць дзецям лекі і наогул выкарыстоўваць сродкі знішчэння шкоднай жамяры і чарвей на агародзе”; лячыць перапалох: змешваць попел з вадой і “змываць толькі сходнімі днямі, як сонца заходзіць. Маладзіком няможна”.

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ